the way of engineeringene civilization is especially underlined. The civilization experiences now a crisis and the necessity of transition of the East Slavic world to agiocratic government is stresseded.

УДК 947.6. “1944–1948”

# ДА ПЫТАННЯ АБ ФАРМІРАВАННІ ЗАХОДНЯЙ МЯЖЫ БССР У ПАСЛЯВАЕННЫ ЧАС (НА ПРЫКЛАДЗЕ ГРОДЗЕНСКАЙ ВОБЛАСЦІ)

**Н.А. Рыбак**
УА “Гродзенскі дзяржаўны аграрны універсітэт”
г. Гродна, Рэспубліка Беларусь

Пытанне савецка-польскай мяжы, усталяванай у верасні 1939 г., заставалася вельмі вострым на працягу ўсёй II сусветнай вайны. Польскі эміграцыйны ўрад, які знаходзіўся ў Лондане, гэтую мяжу адмовіўся прызнаць і выступаў за захаванне савецка-польскай граніцы, вызначанай Рыжскім мірам 1921 г. Супярэчнасці паміж савецкім і польскім бакамі адмоўна адбіліся на двухбаковых адносінах і не дазволілі ўсталяваць цеснае супрацоўніцтва, нягледзячы на тое, што і СССР, і Польшча ўваходзілі ў антыгітлераўскую кааліцыю. Карэнны пералом у вайне, звязаны ў першую чаргу з перамогамі Чырвонай Арміі на савецка-германскім фронце, дазволіў І.Сталіну паставіць так званае “*польскае пытанне*” перад саюзнікамі па антыгітлераўскай кааліцыі. У гэтай сітуацыі Вялікабрытанія і ЗША схіляліся да прызнання “*лініі Керзана*” ў якасці савецка-польскай граніцы [1, с.142]. Афіцыйна дамоўленасць была дасягнута на Тэгеранскай канферэнцыі ў 1943 г. Пры гэтым савецкі ўрад выказаў гатоўнасць пайсці на саступкі на карысць Польшчы. Адпаведна з заявай савецкага ўрада ад 11 студзеня 1944 г. да Польшчы павінна была адыйсці большасць раёнаў Беластоцкай вобласці. Цікавым з’яўляецца той факт, што Масква нават не палічыла патрэбным папярэдзіць савецкае беларускае кіраўніцтва аб сваіх намерах. У Мінску былі ўпэўнены, што Беласточчына застанецца ў складзе БССР. Партыйнае кіраўніцтва БССР 1 студзеня 1944 г. нават вызначыла склад партыйных работнікаў Беластоцкага абкама партыі [2, с.29]. У сакавіку 1944 г. на VI сесіі Вярхоўнага Савета БССР першы сакратар ЦК КП(б)Б П. Панамарэнка назваў мяжу 1939 г. справядлівай, якая ў этнаграфічных і гістарычных адносінах адпавядала інтарэсам Беларусі і Польшчы [2, с.30]. Старшыня Прэзідыюма Вярхоўнага Савета БССР Н.Я. Наталевіч звярнуўся да Вярхоўнага Савета СССР і савецкага ўрада з просьбай разглядзець пытанне аб мяжы з улікам



РЕПОЗИТОРИЙ ГГАУ

інтарэсаў беларускага народа і пакінуць спрадвечна беларускія землі ў складзе БССР [1, с.143–144].

Аднак, лёс Беласточчыны быў вырашаны. Але і пазней партыйна-савецкія кіраўнікі Беластоцкай вобласці спрабавалі адстаяць яе ў складзе БССР. 8 ліпеня 1944 г. старшыня Беластоцкага аблвыканкама П.І. Ратайка і сакратар Беластоцкага абкама партыі А.П. Эльман накіравалі на імя першага сакратара ЦК КП(б)Б П.К. Панамарэнкі дакладную запіску, у якой яны паспрабавалі даказаць, што Бельскі, Заблудаўскі і Беластоцкі раёны з'яўляюцца спрадвечна беларускімі землямі. У гэтым дакуменце давалася гісторыка-дэмаграфічная даведка, згодна з якой гарады Заблудаў, Супрасль, Бельск і Беласток уваходзілі ў склад Берасцейскага княства, а таму яны з раёнамі з'яўляліся, на думку аўтараў запіскі, старажытнымі беларускімі землямі [3, ф.1, воп.1, спр.11, а.3]. Акрамя гэтых довадаў, прыводзіўся нацыянальны склад насельніцтва вышэй адзначаных раёнаў. Так, паводле аўтараў запіскі, на 1941 г. у г. Бельску налічвалася 48 662 жыхароў, з якіх беларусаў – 28 184 чалавекі, што складала 57,9% насельніцтва. Палякаў налічвалася 15 343 чалавекі, што раўнялася 31,5%. Такім чынам, рабілася выснова, што палякі, якія складалі меньш 1/3 насельніцтва горада і раёна (так у дакуменце), з'яўляліся нацыянальным мяньшынствам [3, ф.1, воп.1, спр.11, а.1]. Такія ж высновы рабіліся і ў дачыненні да Заблудаўскага раёна Беластоцкай вобласці. Згодна з запіскай, беларусы складалі палову насельніцтва раёну [3, ф.1, воп.1, спр.11, а.2]. Пераважна беларускім па нацыянальнаму складу, на думку кіраўнікоў Беластоцкай вобласці, з'яўляўся і г.Беласток. У 1941 г. у ім пражывала 116 000 чалавек, з якіх палякаў – 39 114 ці 33,7% насельніцтва горада. Такім чынам, большасць жыхароў горада былі беларусы, рускія і яўрэі [3, ф.1, воп.1, спр.11, а.2]. Напрыканцы аўтары дакладной запіскі звярталіся да П.К. Панамарэнкі з просьбай паставіць перад савецкім урадам пытанне аб захаванні ў складзе СССР (адпаведна ў БССР) г.Беластока, Беластоцкага, Бельскага і Заблудаўскага раёнаў [3, ф.1, воп.1, спр.11, а.3]. Аднак, гэтыя просьбы былі праігнараваны Савецкім ўрадам, які ў вырашэнні пытання аб савецка-польскай мяжы меньш за ўсё ўлічваў інтарэсы беларускага народа.

24–26 ліпеня 1944 г. у Маскве адбыліся перамовы паміж Савецкім урадам і Польскім камітэтам нацыянальнага вызвалення (ПКНВ), дзе абмяркоўвалася пытанне аб дзяржаўнай мяжы паміж Польшчай і СССР. 27 ліпеня 1944 г. урад СССР падпісаў пагадненне з ПКНВ аб правядзенні мяжы па так званай "*лініі Керзана*", пры гэтым на карысць Польшчы саступалася тэрыторыя, якая знаходзілася на ўсход ад вышэй

адзначанай лініі: а) тэрыторыя да р.Заходні Буг і Салокія; б) частка Белавежскай пушчы на участку Няміраў–Ялаўка, пакідаючы Польшчы Няміраў, Гайнаўку, Белавежу і Ялаўку [4, с.19]. Па сутнасці, гэта азначала ліквідацыю Беластоцкай вобласці БССР. Аднак, яшчэ да афіцыйнага ўрэгулявання гэтага пытання і прыняцця адпаведнага рашэння аб скасаванні Беластоцкай вобласці, на Беласточчыне аднаўляліся савецка-партыйныя структуры, працавалі камсамольска-партыйны актыў, органы НКУС. Выклікаюць цікавасць справаздачы сакратара Крынкаўскага райкаму КП(б)Б Блінова, накіраваныя сакратару Беластоцкага абкаму А.Эльману, аб палітычнай сітуацыі і дзейнасці партыйна-савецкіх органаў у ліпені 1944 г. Так, 22–23 ліпеня ў Крынкаўскім раёне былі абраны старшыні сельсаветаў, у сельсаветы накіраваны партыйна-савецкія супрацоўнікі для вядзення "*палітмасавай работы*". У горадзе былі размешчаны савецкія і партыйныя ўстановы, падбіраліся кадры на кіраўнічыя пасады. З мясцовым насельніцтвам пачалі праводзіцца суразмовы, расклейваліся савецкія плакаты і лозунгі. Быў падрыхтаваны і цалкам набраны матэрыял для перашага нумару раённай газеты, а яе назву запрасілі ў ЦК КП(б)Б [3, ф.1, воп.1, спр.14, а.1].

Але мерапрыемствы па аднаўленню савецкай улады, нягледзячы на разгорнутую масавую агітацыю, у цэлым, былі негатыўна сустрэты большасцю польскага насельніцтва Беластоцкай вобласці. Аб гэтым сведчыць спецыяльнае данясенне: "*Настроение польского населения в связи с приходом Красной Армии и восстановлением Советской власти*" ад 6 жніўня 1944 г., складзенае кіраўніком Упраўлення НКУС Беластоцкай вобласці падпалкоўнікам Грэдасавым. З яго вынікала, што "*вступление частей Красной Армии в Белостокскую область большинство польского населения встретило недружелюбно. На этой почве отмечаются факты высказывания пораженческого и антисоветского настроений*" [3, ф.1, воп.1, спр.12, а.4]. Антысаветызм мясцовага польскага насельніцтва праяўляўся як у пасіўных формах супраціву (сабатаж і байкот мерапрыемстваў савецкай улады, антысавецкая агітацыя), так і актыўных (узброенная барацьба). НКУС імкнуўся падавіць усе формы супраціву. Супрацоўнікі сілавых структур Беластоцкай вобласці пачалі актыўна працаваць на выкрыццё польскага падполля літаральна адразу пасля вызвалення вобласці ад фашысцкіх захопнікаў. Так, калі 22 чэрвеня 1944 г. у г.Крынкі "*группа польских националистов вывесила в центре города польский флаг*", раённае адзяленне НКУС адразу выехала на месца здарэння і пачало праводзіць следчую работу. У выніку было высветлена, што ў раёне дзейнічае польскае падполле ў складзе 72 чалавек. Усе сілы



РЕПОЗИТОРИЙ ГГТАУ

супрацоўнікаў НКУС былі кінуты на яго ліквідацыю [3, ф.1, воп.1, спр.14, а.1]. Пад час правядзення агентурна-следчай работы, у пачатку жніўня 1944 г. у Крынках была выкрыта польская арганізацыя "*Саюз польскіх патрыётаў*", якую узначальваў нехта Камінскі. Арганізацыя праводзіла антысавецкую агітацыю [3, ф.1, воп.1, спр.12, а.12].

Нягледзячы на ўсе намаганні сілавых структур ліквідаваць антысавецкі супраціў, сітуацыя ў Крынкаўскім раёне і Беластоцкай вобласці ў цэлым, заставалася напружанай. Гэта падцвярждаецца справаздачай ад 6 верасня 1944 г. аб палітычнай сітуацыі ў Макараўскім сельсавеце Крынкаўскага раёну сакратара раёнага камітэту камсамола (прозвішча ўстанавіць не ўдалося): "*Несмотря на многочисленные беседы, доклады, а также массово-разъяснительную работу в Макаровском сельсовете большинство населения не подчиняется законам Советской власти, с работниками райисполкома и РК КП(б)Б, которые прибыли из партизанских отрядов, даже не хотят разговаривать. Ихние слова: "партизаны, лучше не являйтесь в сельсовет, а то разрубим топорами". Был случай когда пришли в сельсовет работники РВК, население... стало собираться с вилами, косами, топорами... Организаторы этого дела агитируют народ за "свободную Польшу" и за "правительство Миколайчика*" [3, ф.1, воп.1, спр.14, а.14]. Польскае насельніцтва Беластоцкай вобласці байкатавала ўсе мерапрыемствы савецкай улады. Як адзначалася ў справаздачах пратыйна-савецкіх органаў вобласці, была пастаўлена пад пагрозу зрыву мабілізацыя ў Чырвоную Армію, распаўсюджваліся антысавецкія, "*правакацыйныя*" чуткі [3, ф.1, воп.1, спр.12, а.4–5].

Такім чынам, значная частка насельніцтва Беластоцкай вобласці негатыўна сустрэла аднаўленне савецкай улады ў пасляваенны перыяд. Асабліва гэта тычылася заходніх раёнаў, дзе пераважалі палякі і беларусы-каталікі і дзе актыўна дзейнічала польскае падполле. У выніку, кіраўнікі савецкай краіны хацелі пазбавіцца ад гэтых тэрыторый, якія паспелі стаць "*гарачай кропкай*" на мапе пасляваеннай Беларусі. 25 жніўня 1944 г. на паседжанні бюро ЦК КП(б)Б разглядалася пытанне аб стварэнні замест Беластоцкай вобласці Гродзенскай і было прынята адпаведнае рашэнне [5, ф.4, воп.61, спр.63, а.3]. 20 верасня 1944 г. гэта было вырашана на ўзроўні кіраўніцтва савецкай дзяржавы. Старшыня Прэзідыюма Вярхоўнага Савета СССР М.Калінін і сакратар А.Горкін падпісалі Ўказ "*Аб утварэнні Бабруйскай, Гродзенскай і Полацкай абласцей у складзе Беларускай ССР*". У дакуменце адзначалася ўтварэнне "*Гродзенскай вобласці з цэнтрам у г.Гродне, уключыўшы ў склад Гродзенскай вобласці г. Гродна і раёны – Бераставіцкі, Ваўкавыскі, Гродзенскі,*



РЕПОЗИТОРИЙ ГГАУ

*Свіслацкі, Скідзельскі, Сапоцкінскі, г. Ліду і раёны – Васілішкаўскі, Воранаўскі, Жалудоцкі, Зэльвенскі, Лідскі, Мастоўскі, Радунскі, Шчучынскі і Поразаўскі*” [6, с.21–22].

Мяжа, якая была праведзена ўздоўж “*лініі Керзана*” з адступленнем на карысць Польшчы значных тэрыторый не мела ні гістарычных, ні этнічных падстаў. Аднак, на гэтым перадача беларускіх зямель не спынілася. 16 жніўня 1945 г. паміж савецкім і польскім урадамі была падпісана дамова пра савецка-польскую мяжу. Аднаведна ёй прадугледжваліся адступленні ад “*лініі Керзана*” на карысць Польшчы не да 5–8 км, як гэта было вырашана на Крымскай канферэнцыі 1945 г., а да 30 км [1, с.145]. Такім чынам, новая савецка-польская мяжа адрэзала ад Беларусі тэрыторыю плошчаю 14,3 тыс. км кв. з насельніцтвам (паводле перапісу 1931 г.) каля 722 тыс. чалавек, а паводле перапісу 1946 г. – каля 638 тыс. чалавек [7, с.43]. Трэба адзначыць, што і пазней яшчэ некалькі разоў адбываліся змены мяжы. У 1946–1947 г. савецка-польская мяжа перасоўвалася на карысць Польшчы на 100-3000 м, у выніку чаго польская тэрыторыя пашырылася за кошт 27 населяных пунктаў Гродзенскай вобласці [7, с.44]. У 1950 г. Польшчы былі перададзены яшчэ 30 населеных пунктаў Гродзенскай вобласці [7, с.52]. Канчатковае ўрэгуляванне памежных пытанняў паміж Польшчай і БССР адбылося толькі ў сярэдзіне 1955 г., калі з Гродзенскай вобласці да Польшчы адышло 26 вёсак і 4 хутары [2, с.42].

Стаўленне насельніцтва да змены мяжы і, у сувязі з гэтым, да абвешчаннага абмену насельніцтвам паміж БССР і Польшчай, а таксама перасялення з 800-мятровай памежнай паласы было адмоўным. Палякі, якія згодна з умовамі рэпатрыяцыі павінны былі выехаць у Польшчу, адмаўляліся ад пераезду. Такія паводзіны былі выкліканы некалькімі прычынамі. Па-першае, савецка-польская мяжа ўвесь час змянялася на карысць Польшчы і некаторая частка польскага насельніцтва разлічвала на вяртанне мяжы 1921 г. Так, адпаведна з спецданясеннем кіраўніка Ўпраўлення НКУС Беластоцкай вобласці падпалкоўніка Грэдасава ад 20 верасня 1944 г. “*О политическом настроении польского населения г. Гродно и Гродненского района*” вынікала, што: “*Большая часть польского населения г. Гродно и Гродненского района соглашение советско-польского правительства от 14 сентября 1944 г. по вопросу предстоящего обмена населения между СССР и Польшей встретило равнодушно и с недоверием. По этому вопросу ведутся разговоры в двух направлениях: одни говорят, что соглашение выполняться не будет, т.к. польское правительство, находящееся в Лондоне, добьётся своего и Польша будет в старых*



РЕПОЗИТОРИЙ ГГАУ

*границах 1939 г., другие говорят, что со своих мест никуда не поедут и имеющиеся земли не отдадут*" [3, ф.1, воп.1, спр.12, а.19]. Наступнымі прычынамі, па якіх палякі адмаўляліся ад выезду ў Польшчу, як бачым, былі нежаданне кідаць сваю гаспадарку (гэта тычылася ў першую чаргу вясковага насельніцтва) і недавер да ўмоў рэпатрыяцыі. Так, 18 верасня 1944 г. Яніна Амбражэвіч, полька, якая пражывала ў г. Гродна, заявіла: "*В Польшу я не поеду, потому, что имею здесь своё хозяйство, кроме этого проживаю здесь давно"* [3, ф.1, воп.1, спр.12, а.18]. Некаторыя палякі настолькі не верылі савецкай уладзе, што лічылі, што замест Польшчы іх вывезуць у Сібір ці на Поўнач СССР. Так, жыхарка г. Гродна, полька Алена Капель 14 верасня 1944 г. сярод сваіх калег гаварыла: "*я сегодня слышала, что поляков, которые будут регистрироваться на выезд в Польшу, всех будут выселять не в Польшу, а на Север*" [3, ф.1, воп.1, спр.12, а.17]. Гэтыя чуткі распаўсюджваліся сярод насельніцтва польскім падполлем, якое заклікала не выезжаць за "*лінію Керзана*".

Нежаданне польскага насельніцтва ехаць у Польшчу было яшчэ абумоўлена і ваеннымі дзеяннямі, якія абдываліся ў суседняй краіне. Так, селянін вёскі Новая Мыш Баранавіцкай вобласці сфармуляваў агульны настрой сваіх аднавяскоўцаў: "*...граница ведь окончательно не установлена. В Польше ещё война – подождём. Посмотрим как сложится обстановка дальше*" [8, ф.7580, воп.3, спр.175, а.13–14]. Пачакаць з выездам заклікаў 25 верасня 1944 г. настаўнік Рыгор Вяжэўскі: "*Если поляки уедут, следовательно не желают, чтобы Гродно оставался польским городом. Долг каждого поляка остаться. Ни одна вёска не выедет. Теперешнее польское правительство только военное. После войны может измениться. Надо ждать*" [3, ф.1, воп.1, спр.12, а.43–44].

Цікавым з'яўляецца той факт, што палякі разлічвалі на дапамогу Англіі і ЗША ў аднаўленні межаў Польшчы да 1939 г. Так, была вельмі распаўсюджана думка, што "*граница между Польшей и СССР будет проходить там, где укажет Англия*" [3, ф.1, воп.1, спр.12, а.77]. Таму польскае насельніцтва праяўляла цікавасць да міжнародных падзей. Як адзначалася ў спецданясенні кіраўніка Ўпраўлення НКУС Гродзенскай вобласці падпалкоўніка Грэдасава ад 16 кастрычніка 1944 г.: "*Выступлением в палате общин английского премьер-министра Черчилля, поляки живо интересовались, в связи с тем, что газет с этой речью было мало, поэтому поляки имели большой спрос на газеты с речью Черчилля. За эту газету платили по 50 рублей. Интересовались главным образом, той частью речи Черчилля, где он говорил по вопросу Польши. Однако, после чтения этой газеты поляки*



РЕПОЗИТОРИЙ ГГАУ

*не верят, в то, о чём сказал Черчилль и заявляют, что это пропаганда большевиков. Черчилль так сказать о Польше не мог*" [3, ф.1, воп.1, спр.12, а.69].

Такім чынам, польскае насельніцтва адмаўлялася верыць у тое, што пытанне савецка-польскай мяжы ўжо было вырашана на міжнароднай арэне і заходнія дзяржавы пайшлі на саступкі І.Сталіну, прызнаўшы "*лінію Керзана*" ў якасці мяжы паміж Польшай і СССР. Гэтым тлумачыцца адмоўнае стаўленне польскага насельніцтва да рэпатрыяцыі ў гэты час. Згодна з спецданясенем кіраўніка Ўпраўлення НКУС Гродзенскай вобласці падпалкоўніка Грэдасава ад 5 кастрычніка 1944 г.: "*С момента опубликования советско-польского соглашения, со стороны поляков, проживающих в г.Гродно и Гродненском районе, никто ещё не заявил о своём желании выехать на территорию Польши. При этом некоторые из них высказывают намерения, что в случае выселения в Польшу они уничтожат свои постройки путём сожжения*" [3, ф.1, воп.1, спр.12, а.85]. Сітуацыя пачала змяняцца ў 1945 г., калі палякі ўбачылі трываласць савецка-польскай мяжы і пачалі масава запісвацца на выезд у Польшчу, каб выратавацца ад калектывізацыі і сталінскіх рэпрэсій.

Усталяванне мяжы яшчэ адным бокам адбілася на мясцовым насельніцтве. Было прынята рашэнне аб пераносе вёсак з 800-мятровай памежнай паласы. Толькі з Бераставіцкага раёну Гродзенскай вобласці падлягалі высяленню 275 гаспадарак [7, с.48]. Зразумела, што большасць вяскоўцаў былі незадаволены гэтым і не спяшаліся пакідаць свае гаспадаркі. Аналагічная сітуацыя назіралася і ў Сапацкінскім раёне. Так, начальнік 16 пагранатраду МУС Беларускай акругі палкоўнік Грэкаў паведамляў старшыне Гродзенскага абкаму кампартыі П.З. Калініну, што рашэнні, прынятыя на бюро абкама пра заканчэнне перасялення мясцовага насельніцтва з 800-мятровай памежнай паласы на тэрыторыю Гродзенскага раёну, не выконваюцца. Тэрмін заканчэння перасялення быў прадугледжаны 6 снежня 1947 г. Аднак, згодна з інфармацыяй палкоўніка Грэкава: "*...на территорию Гродненского района было отселено 31 хозяйство, а в период с 6 по 17 декабря (1947 г.) отселение вообще не производилось. Секретарь Сопоцкинского РК КП(б)Б и пред.райисполкома на мои просьбы об ускорении разборки и вывозки из 800-й полосы построек д. Куженец – не реагируют*" [3, ф.1, воп.1, спр.136, а.445]. Усяго на 1948 г. пакінуць сваі хаты павінны былі 583 гаспадаркі [7, с.51].

Такім чынам, пытанне фарміравання савецка-польскай мяжы вырашалася саюзным кіраўніцтвам без ўдзелу партыйна-савецкіх кіраўнікоў БССР. Пры гэтым інтарэсы беларускага народа ігнараваліся.



РЕПОЗИТОРИЙ ГГАУ

Абраная ў якасці мяжы “*лінія Керзана*” не мела ні гістарычных, ні этнічных падстаў. На карысць Польшчы была перададзена значная частка тэрыторыі БССР, у выніку чаго існаваўшая з 1939 г. Беластоцкая вобласць была скасавана, а з яе рэштак створана Гродзенская. Усталяванне новай мяжы выклікала шэраг мер: абмен насельніцтвам і высяленне з 800 м памежнай паласы. У выніку гэта прывяло да абвастрэння грамадска-палітычнай сітуацыі ў Гродзенскай вобласці БССР у пасляваенны час.

Літаратура

1. Снапкоўскі У. Міжнародныя аспекты вызначэння савецка-польскай граніцы ў 1943–1945 гг.// Назаўсёды разам. Да 60-годдзя ўз’яднання Заходняй Беларусі з БССР.– Мн.: БелЭн, 1999.– С.142-146.
2. Вялікі А. На раздарожжы. Беларусы і палякі ў час перасялення (1944–1946 г.).– Мн.: БДПУ, 2005.– 319 с.
3. Дзяржаўны архіў грамадскіх аб’яднаняў Гродзенскай вобласці.
4. Советский Союз – народная Польша (1944–1974 гг.): Документы и материалы.– М.: Политиздат, 1974.– 664 с.
5. Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь.
6. Крэнь І.П., Белазаровіч В.А. Гродзенскай вобласці 60 гадоў.// 60-летие образования Гродненской области: Материалы Междунар. науч. конф., 3–4 марта 2004 г., Гродно./ Отв. ред. В.А.Белозорович.– Гродно: Гр ГУ, 2004.– С.17-28.
7. Сідлярэвіч А. Фарміраваньне сучаснае беларуска-польскае мяжы ў дакумэнтах і вусных успамінах (1944–1950).// Спадчына.– 2002.– №2–3.– С.35-55.
8. Дзяржаўны архіў Брэсцкай вобласці.

Резюме

В статье на примере Гродненской области рассматривается процесс формирования западной границы БССР в послевоенное время. Опираясь на архивные свидетельства, автор пришёл к выводу, что высшее руководство СССР решало территориальные проблемы с Польшей без учёта национальных интересов белорусского народа.

Summary

In article on an example of the Grodno region the process of formation of western border BSSR after war is considered. Leaning on the archival certificates, the author has come to a conclusion, that a manual USSR decided territorial problems with Poland without the account of national interests of the Belarusian people.

РЕПОЗИТОРИЙ ГГАУ

УДК 811.161.3:378.147

# ВЫКАРЫСТАННЕ МЕТОДЫКІ АКТЫЎНАГА НАВУЧАННЯ ПРЫ ЛІНГВІСТЫЧНАЙ ПАДРЫХТОЎЦЫ СТУДЭНТАЎ

**З.Я. Садоўская**
УА "Гродзенскі дзяржаўны аграрны універсітэт"
г. Гродна, Рэспубліка Беларусь

Асноўная задача вышэйшай школы ў наш час – падрыхтоўка спецыяліста, здольнага самастойна ажыццяйляць прафесійную дзейнасць, павышаць свой кваліфікацыйны ўзровень і агульную культуру асобы.

Актыўныя метады навучання дапамагаюць студэнтам авалодаць не толькі ведамі, не толькі наборам карысных і неабходных навыкаў, але і ўменннем мысліць творча і крытычна, валодаць развітым гаварэннем, быць умелымі лідэрамі, упэўнена і матывавана падыходзіць да пастаўленых задач.

Да формаў арганізацыі вучэбнага працэсу ў вышэйшай школе адносяцца лекцыі, семінарскія і практычныя заняткі, самастойная работа студэнтаў і педагагічны кантроль. Выкарыстанне некаторых актыўных метадаў навучання праілюструю на прыкладзе лекцый, практычных заняткаў і форм кантролю.

1. У сучаснай вышэйшай школе даволі часта па-ранейшаму выкарыстоўваецца традыцыйная лекцыя, у час якой найбольшая актыўнасць праяўляецца выкладчыкам, які імкнецца перадаць студэнтам як мага больш інфармацыі, а задача слухачоў – напісанне канспекта. Адна з галоўных праблем такой лекцыі – адсутнасць часу для асэнсавання і абмеркавання інфармацыі, якая паступае ад выкладчыка. І для таго, каб актывізаваць вучэбна-пазнавальную дзейнасць студэнтаў, іх самастойную аўдыторную працу можна зрабіць выклад больш цікавым, выкарыстоўваючы лекцыі праблемнага характару, на якіх матэрыял падаецца як адказ на пастаўленую праблему. Выкладанне матэрыялу на праблемнай лекцыі адрозніваецца і тым, што лектар будуе сваю прамову ў выглядзе разважання, а гэта дае магчымасці студэнтам прымаць актыўны ўдзел у абмеркаванні праблемных пытанняў. З цікавасцю ўспрымаецца студэнтамі і лекцыя з працэдурнымі паўзамі. У час такіх лекцый чаргуецца актыўнасць лектара і навучэнцаў.

2. Асноўнай формай арганізацыі вучэбнага працэсу па беларускай мове з'яўляюцца практычныя заняткі, на якіх можна выкарыстоўваць розныя віды актыўных метадаў навучання.



РЕПОЗИТОРИЙ ГГАУ